Беларускі Шлях

Адрас: Рэдакцыі Ново-Серпухуская 29. Адміністрацыі Захароуская «Юбілейны Дом».

Рэдакцыя адчынена ад 1 до 2 гадз пасьля поудня. Адміністрацыя — зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.

Рэдакцыя пакідае за сабой права паправіць пэрасыланые рукапісы і карэспандэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Падпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 руб.

Цана абвестак: за верш пэтыту на 1-й стран 1 руб. на апошняй — 50 к п

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 93. Менск. Пятніца 19 ліпня 1918 г. Год I

АБВЕСТКІ.

На аспові артыкулаў 22, 23, 24, 25 і 112 Станоішча 29 верэсня 1917 г. аб месьскіх прыбытках, выдатках ьметах і падрахунках Менская Месьская Управа апавешчае, аб усе ведалі, што ацэнка нірухомых меняў у месьці Менку дзеля ўзыскання меськаго ацэначнаго збору у 1918 гоэе паводлуг мінулаго году **нізмянілася** за выключэннем меняў перабудованых і зноў зарэгістрованных, а так сама нажачых казённым, царкоуным і манастырскім установам.

Ацэначны збор ад нірухомых менняў у карысьць мета Менску на 1918 год вызначэны у размеры 20°/о чыай прыбытнасьці ад іх і павінен быць ўнесены у месьскую ассу ні пазней 15 жніўня гэтаго году па новаму стылю ры разасланых меськай управай акладных лістах.

Зборы, ні ўнесеныя да гэтаго сроку, лічуцца нідаімкай на іх ад 1-го верэсня г.г. будзе далічацца пэня у размеы 1 кап. ад кожнаго рубля нідаімкі у месяц, прычым сума нідаімкі у 50 і болей капеяк лічыцца за поўны рубель ні кончэны месяц за поуны. Скаргі на ацэнкі павінны ыць заяулены Управе ні пазней 1-го жніуня гэтаго году. д 15-го верэсня г.г. ніуплачэная нідаімка збору 1918 го-будзе узысківацца праз міліцыю прымусовым спосабам.

8 ліпня 1918 г.

Месьскі Войт **С. Хржонстоускі.**

За Сэкрэтара **Позняк.**

Дзелавод **Р. Борткевіч.**

№ 72/7926.

Агульныя весткі.

БЭРЛІН. 15/VII. У сфэры акады Срэдзіземнаго мора ействіямі нашых субмарын топлено 4 параходы і адзін русны карабель, усяго 17000 . тонн.

Начальнік морск. штабу.

ЭЛЬБЭРФЭЛЬД. Аб адважм паступку 16-летняго гімзіста Гэрліха, каторы быў вёсцы Шварцэя на ураджайй успамагацельнай рабсце, ведамляе «Эльбэрфэльдэр нэральанцэйгер». Гэрліх угдзіў у вышыне 800 мэтраў малёт, з якога паказываліся нэныя струі. Хутка пасьля таго аппарат спусьціўся. Гэ быў францускі біплан с эма кулямётамі і прыспасабннем дзеля скідывання бомб. бодвы лятуны, амэрыканскі ручык і подпаручык, былі яты Герліхам, каторы быў узброенны, у палоп, а пом, пры пемачы двух падыоўных асоб, аддапы уласьцям. Як паказываюць палонныя, яны падняліся у флотыліі 6 самалётаў, дзеля атакі Кобленца, але усе былі забіты.

БАЗЭЛЬ, 15/VII. Большая часьць тарговых і заводскіх прэдпрыімстваў у Парыжы рашыла перанесьціся у сярэднюю Францыю або паўднёвей.

Весткі з Расіі.

ШТОКГОЛЬМ. Арэштованы нідаўна вядомы расійскі пісьменнік А. Амфітэатроў вельмі падазронны у замешаннасьці у Маскоўскім бунце. Зробленае у гэтым кірунку разсьледаванне дало ўласьцям вядомыя ісходныя пункты, каторыя цяпер знаходзяцца у строгай тайне. Вобыск, зроблены у памешканні Амфітэатрова рэзультатаў ніякіх аднак ні даў.

Размер абарота крэдытак. Згодна «Фінансыял Тайм», ад 25-го чэрвеня, размер абарота папера[illegible]ай у Расіі лічыцца у 43—44 міліярды рублёў.

МАСКВА. Друк памешчае адозву розных работніцкіх арганізацый і аддзельных членаў партыі левых соцыялістаў-рэвалюцыянэраў, каторымі асуджаецца способ дзействій партый. Адна часьць соцыял-рэвалюцыянэраў перайшла да большэвікоў, другая да правых эсэраў. «Правда» публікуе вось якое рэшэнне Усерасійскаго савецкаго конгрэсу: Арганізатары і учасьнікі забіўства пасла і поўстанне кепска выкарысталі афіцыяльным становішчом іх сатаварышаў. Конгрэс вымагае строгай кары праступнікаў. Для такіх арганізатараў німа мейсца у саветах дэпутатаў. Глаўнае заданне савету — абвешчэнне міра. Толькі у выпадку наступлення на Расію чужой страны, доўгам усіх рабочых селян і справядлівых грамадзян будзе абарона страны проціў імпэрыялістаў.

ГААГА. «Дэйлі Кронікль» паведамляе з Масквы, што вялікія ваенныя сілы большэвікоў знаходзяцца па пуці на Далёкі Усход. Першым чынам маюць зноў заўладаць Іркуцкам. Так-сама падгатаўляецца і атака проціў чэхо-словакаў у Владзівастоку. Карэспандэнт кажа, што, ні гледзючы на соц.-рэвалюцыянэраў, настрой у Пецярбурзі робіцца усё болей варожым да дзержаў Згоды; нават у грамадзянскіх кругах гэто прыкмечаецца. Апасаецца, што Расія уцягнецца у новы ваенны камфлікт, на гэты раз з дзержавамі згоды, пасьля таго як Англія урвалася на Мурманское ўзбярэжжо, Японія на Усход і Французы з адным батальёнам у Харбін.

Ліст Мілюкова. Нідаўно пры рэвізыі у аднаго с Курскіх абывацеляў быў знойдзены ліст кадэтскаго лідэра П. Н Мілюкова. У лісьце гэтым перадрукованым у «Курской Жизни», быўшы міністр габінэту кн. Львова піша:

«У адказ на Вашыя пытанні, як я аглядаюся цяпер на зроблены намі пераварот, чаго спадзеюся ад будучыны, і як ацэніваю ролю і значэнне існуючых партыяў і арганізацыяў, пішу Вам гэты ліст, прызнацца павінен, с цяжкім сэрцам...

Таго, што зрабілося, мы, канечне, ні хацелі. Вы ведаеце, што наша мэта аграпічывалася дасягненнем рэспублікі ці констытуцыйнай монархіі з імпэратарам, які меў бы толькі номінальную уладу, пераважаючаго у панстве уплыву інтылігэнцыі і раўнаправія жыдоў... Мы думалі, што улада зьбярэцца і астанецца у руках першаго габінэту міністраў...

Трэба прызнацца, што нікаторыя, нават з нашай жа партыі паказвалі нам на магчымасьць таго, што сталося потым, ды і мы і самі ні без трывогі прыглядаліся да ходу арганізацыі работнічых масс і пропаганды у арміі. Што-ж рабіць? Зрабілі абмылку у 1905 годзе у адзін бок, цяпер зрабілі зноў, але у другі бок. Тады ні аценілі поўнасьці сілы крайніх правых, цяпер ні прэдбачылі бойкасьці і нісумленнасьці соцыялістаў. Скуткі бачыце самі...

Але, канечне, мы павінны прызнаць, што моральны адказ за стаўшае ляжыць на нас, т. е. на блоку партыяў Гасударсьцьвенай Думы. Вы ведаеце, што цьвердае пастанаўленне выкарыстаць вайну для перавароту было паўзято намі у скорасьці пасьля пачатку вайны; ведаеце, так само, што чакаць мы ні маглі, бо зналі, што у канцы красавіка і у пачатку траўня наша армія павінна была перайсьці у наступленне, скуткам чаго, было-б німагчымым нідавольство і выбух у панстве патрыотызму і радасьці Вы разумееце цяпер, чаму я у апошні момэнт вагаўся даць сваю згоду на пераварот, разумееце так сама, якім у абэцны момэнт павінно быць мае ўнутрапае самачуцце...

Што-ж рабіць цяпер? — Ні ведаю. Тоест, у сярэдзіне мы абое ведаем, што ратунак Расіі у звароце да монархі, ведаем, што усе здарэнні апошніх двух месяцаў выразна даводзяць, што народ ні здольным аказаўся спажыць свабоду, што масса насялення, якая ні прычыняецца да мітынгаў, і зьездаў настрояна монархічна, што шмат і шмат хто падаючы голас за рэспубліку, робіць гэта дзеля страху. Усё гэто ясно, але прызнаць гэтаго мы проста ні можам.

Прызнанне — ёсьць руіна справы усяго нашаго жыцця, крах усяго сьветапагляду, якія мы рэпрэзэнтуем. Прызнаць ні можам, проціў рабіць ні можам, бо ні можам злучыцца с тымі правымі, падчыніцца тым правым, з якімі мы так доўга і так намысьлёна змагаліся...

Канечне, гэты ліст строга конфідэнцыяльны. Можэце паказаць яго толькі членам нашаго кола».

С Крыму.

АДЭССА. 14 гм. На пасаду міністра нар. асьветы высоўваецца у крымскім урадзе кандыдатура З. С. Карапачынскаго, нідаўна скончыўшаго унівэрсытэт і цяпер спаўняючаго абавязкі цэнзора сымфэропольскіх газэтаў.

СЫМФЕРОПОЛЬ. 13 гм. Міністр народнай асьветы і кантралёр крымскаго ураду Налбандов у бяседзе с супрац. газэт, заявіу, што урад устанаўляе аўтаномію, але ні нізалежнасьць Крыму. Паміж Крымскім і Украінскім урадамі конфліктаў ні было. Да ураджаю Крым пратрымаецца сваімі хлебнымі запасамі без запамогі поўночных паветаў Таврыі. Стварэння дорага каштуючаго адміністратыунаго апарату ні будзе, арміі і флоту німа, дзеля таго міністр думае справіцца з грашовымі затрудненнямі. Апрацаванне закону аб новых месьскіх выборах даручаецца зьездам месьскіх і земскіх дзеячоў. Урад утрымаецца ад уплыву на іх. Аб крымска-татарскім парлямэнце п. Налбандов сказаў, што двух урадаў у Крыме ні можа быць. Міністр прызнае

культурна-нацыянальную аўтаномію і дапушчае істнаванне социялістычных арганізацыяў. Далей міністр кажэ, што чуткі аб агранічэннях для асобных нацыяў ніпраўдзівы і запэўняе, што урад нічога ні будзе рабіць рэакцыйнаго і агрэссіўнаго.

Як грыбы растуць...

Гэта цэны у Менску па магазынах. За астатнія два тыдні дык аж на сто працэнтаў падняліся! І падняліся на старых таварах. На Губарнатарскай два тыдні таму назад у магазыне бачыў бялізну па 15 марак за штуку, а сягоння тая самая штука мае ўжо пэтлічык з надпісам 30 марак! Пашоў тады далей я па горадзе і дай прыглядацца на цэны. Бачу: паўбоцікі, што перш цаніліся 125 марак, цяпер тыя самыя цэнюцца 250 марак. Абыйшоў з дзесяток магазынаў — усюды, як згаварыўшыся, цэны, як посьля дажджа, узрасьлі. І чаму? Бо, кажуць гандляры, мусім купляць тавар за рускія грошы, а прадаваць за акупацыйныя, на гэтым маем страту. Во як для ашуканства людзей чмуцяць! Ведама ёсьць, што купля тавараў так-сама за акупацыйныя грошы вядзецца, а узрост цэн на даўна закупляныя тавары ідзець без страху, бо німа на гэта кары. Увесь торг трэба каб ішоў праз коопэратывы, дык справядлівей будуць цэны трымацца.

А. Адамовіч.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

У І-м пазычкова-зьберагацельным т-ве 14-го ліпня на адбыушымся гадовым сходзе поунамоцных былі разгледзяны—падрахунак за мінулы год, сьмета на бягучы, выбраны асобы для пасад і інш. Падрахунак констатыруе дэфіцыт т-ва па варункам ваеннаго часу, лк кольвек пакрыты з абаротных грошай таварнаго аддзелу у размеры 8.000 руб.

Цікавы 2 пастановы: 1) аб выбранні камісіі дзеля перабокі уставы т-ва у кірунку павялічэння максымальнай цыфры пазычак ад 500 да 1000 руб. пад залог мення і 2) аб прымусу т-ва узаемнаго крэдыту аб выдачы апошнім знаходзючыеся на бягучым рахунку сумм т-ва, дзякуючы чаму было б мажліва расшырэнне пазычковых апэрацый. Упоунамоцныя пазычкова-зьберагацельнаго т-ва паставілі на від т-ву узаемнаго крэдыту, што яны, у выпадку апошнім нівыдачы грошай, прымушаны будуць зьвярнуцца у акружны суд, каб спаганяць адміністратыуным парадкам. У члены праулення выбраны, с прычын занядужання Бэссэра, Вішнеускі, у члены савета—дробны адвокат Ігнатовіч. На сходзе было, разам 100 упаунамоцных, усяго толькі—24, завядомыя староннікі савета і праулення, дзякуючы чаму усе пытанні павесткі дня прайшлі болей чым гладка.

Паездкі без пропуснау, дазволеныя нямецкімі уласьцямі у Гомель, Маладэчну, Барановічі і Оршу, адразу павялічылі лік выбываючых з Менску пасажырау, глаунае на Гомель і Оршу.

У вольнай прадажы цэны на хлеб, даходзючы апошнімі часамі да $3^{1}/_{2}$—4 руб. за фунт, пачынаюць патроху падаць. 17-го і 18-го ліпня хлеб мейсцамі црадаваўся па 2 р. 20 к.—$2^{1}/_{2}$ руб. за фунт.

Прычыны раптоўнаго упадку цэн на хлеб лежаць у блізасьці новаго ураджаю, каторы ажывіу надзеі вескі, схаваушай запасы, і у прапанаваным дазволу нямецкімі уласьцямі па хадатайству меськ. галавы, вольнай прадажы хлеба.

Нямецкі віленскі сімфанічны оркестр, пад дырыжэрством Бруно-Плотова, зусім пераехау у Менск.

У месьскай управе пэнсія за чэрвень гэтымі днямі як кольвек выплачано служачым усе і усім.

Што тычыцца платы за ліпень (20-го чысла), дык на гэто мала надзеі, с прычын безграшоу'я кассы.

Зьменьшэнне штатау закончэно.

Слабое домабудоуніцтво на акраінах, у зьвязі з варункамі мамэнту прывяло да сільнаго зьменьшэння ліку заемшчыкау у крэдытных установах, глаунае у 1-м пазычкова зьберагацельным т-ве, прышоуштаму да вялікаго упадку фінансавых спрау.

Павялічэнне прычта у перэспенскай кладбішчэнскай цэркві, багацейшай у епархіі, па хадатайству парахвіян, запэуняушых, што настояцель о. Флероу ні спрауляецца с пагрэбальнымі трэбамі, епіскапом Гэоргіем прызнано пакуль што зарано.

У губ. прысуцтві шмат трох членау, што прызнаны казеннай палатай лішнім, астаецца па ранейшаму.

Прысуцтвіе, мало баронючы дробных заурадных канцэлярыстау само сябе адбараніло.

Беларускі тэатр. Сягоння, у пятніцу, у месьскім тэатры беларускі спэктакль. Іграюць «Бутрыма Няміру» (другі ужо раз) Ф. Алехновіча з аутарам у заглаунай ролі. Спэктакль закончыць «У зімовы вечар» Э. Ор.эшковай (пераборка с повясьці).

Пачатак а гадз. $8^{1}/_{2}$ у веч.

«Вольная Беларусь» № 26, вышау з друку. Зьмест: Да краевае інтэлігэнцыі, стацця К. Шафнагеля; Сымон Музыка, поэма Якуба Коласа; З вечарынкі, верш Старога Уласа; Наш Валожын, верш Старога Уласа; Чад самагубства, апаведанне Крауцоваго Макара; Кроніка, абвестка і інш.

Весткі с краю.

Гомель.

У тутэйшым земстві адчуваецца вялікая нідастача лекарстваў асабліва вэтэрынарных мэдыкамэнтаў. Цяпер у шмат акіх мейсцох у павеце жывёла хварэе на каросту, а лекарстваў німа. Заходы земства дастаць мэдыкамэнты скончыліся ніудачна. Праз нейкі час ёсьць надзея дастаць лекарствы у Кіеві. Гомельскія гандляры запрасілі такую цану, што земству прышлося адмовіцца ад купоўлі намейспу.

У раёні Носовічскаго вэтэрынарнаго вучастку на быдлё пачалася сыбірская язва. У кароткі час эахварэло 42 штукі, з якіх 24 падохла, а 18 ішчэ хварэе. Вэтэрынарным пэрсоналам робяцца прывіукі. Усяго у Насовічск. вучастку зроблено 832 прыв.

Да гэтаго часу душэунахворых Гомельскае земство адпрауляло у Магілёу. Цяпер, дзеля пры учэння Гомлю да Украіны, мусіць, Магілёу такіх хворых ні прынімае і іх прыходзіцца адпрауляць у Кіеу, што абходіцца шмат даражэй—183 рб. замест 70 рб.

У чэрвеню аграномічны аддзел павятовай земскай управы паслау анкету суседнім павятовым земствам, дзеля азнаймлення с станам ураджаю ад іх. Адказы адрыманы ад 12 земствау Чарнігауск. губ. У адказах зазначаецца, што грошы у земствау німа, работа сьціснута. Ураджай у большасьці паветау задавальняючы. За выключэнием Нежынскаго і Кролевецкаго паветау сенажаці пасьля дажджоу паправіліся. Наагул у Чарнігаучыне чакаюць сярэдняго ураджаю.

Магілеу. Паведамляюць с той часткі Магілёушчыны, якая асталася пад Масквой, што тамака савецкая улада мае уплыу толькі у Клімавічскім пав.; у другіх паветах—перавага заможнейшаго селянства, каторае называе сябе то левымі с.-р., то ніпартыйнымі. Левыя эсэры спраціуляюцца арганізацыі сельскай галоты. Фінансовы стан «савецкіх» установ кепскі.

30 чэрвеня у Магілеускай месьскай радзе разглядалося пытанне аб пасылцэ дэлегатоу у Менскую Беларускую Раду. Проці выступалі м.-д. н.-с., бунд і «соцыялістычны блок» галасамі каторых пытанне правалено.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоунаго камандавання за 17 ліпня 1918 року.

Захадні тэатр вайны.

Група арміяу Кронпрынца Рупрэхта.

Баевая дзейльнасьць ажывілася толькі у вячэрнія гадзіны. Пры стычках разведчыкау паўднева-заходней Іпэрна мы узялі палонных. Паўднева-усходней Гэблотэрна вораг ніусnешна паутарау свае атакі.

Група арміяу Гэрманскаго Кронпрынца.

Мейсцовыя бai у Савіерскай даліне і захадней Шато—Тьерры. Паудне.а-захадней Куртэмон мы кранулі свае лініі да вучастка Сюрмэлін. Сільныя контр-атакі рабіу вораг на наш фронт на паудневым беразі Марна. Яго атакі былі з вялікімі для яго стратамі, часьцю пасьля упартых баеу, намі адбіты. На пауночным беразі Марны усьпехі першаго дня былі расшыраны. Пасьля таго як мы адбілі французкія контратакі мы пайшлі за ворагам да вышыні поуночнай Вантюіль і прайшлі з боем праз лясы Рэзэмат і Королеускі.

На абодвух бакох Ардры мы адкінулі ворага на Рэймскую узвышку паміж Контэйль і пауночней Турсі. Усходней Рэймса становішчо без перамен. Мы трымалі варожыя лініі пад сільным агнем і палепшылі нашыя пазыцыі на рымскай дарозі і на рэцы Сюіпп. Пауночна-захадней Массіжа мы занялі некаторыя узмацованыя узвышкі. Лік палонных болей 18.000.

Над полем бітвы учора зноу зьбіта 36 варожых самалетау і 2 прывязных шары. Лейтэнант Мэнкгофф меу сваю 37, обэрлейтэнант Лерцэр сваю 26, лейтэнант Бэлле сваю 22 і віцэфэльдфэбэль Том сваю 21-ую перамогу у паветры.

Першы Генэрал-кватэрмэйстар **Людэндорф.**

Рэдактар **А. Прушынскі.**

Выдавецтво **«Т-во Заранка.»**

Друкарня Я. А. Грынблята.